# ПАДЗЕІ

## ДАСЛЕДЧЫК ГІСТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ
## (да 60-годдзя Аляксандра Мікалаевіча Вабішчэвіча)



30 кастрычніка 2025 г. 60-гадовы юбілей азначыў выбітны навуковец, гісторык, прафесіянал вышэйшай пробы, беларус з непаўторным нацыянальным каларытам, апантаны даследчык міжваеннай гісторыі Заходняй Беларусі Аляксандр Мікалаевіч Вабішчэвіч, адказны рэдактар серыі 2 часопіса «Веснік Брэсцкага ўніверсітэта». Імя доктара гістарычных навук, прафесара добра вядома не толькі ў Рэспубліцы Беларусь, але і далёка за яе межамі.

Нарадзіўся ён у в. Рубель Столінскага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і Мікалая Мацвеевіча Вабішчэвіча і Вольгі Пятроўны Вабішчэвіч (Пашкевіч). У 1983 г. з залатым медалём скончыў Рубельскую сярэднюю школу. У тым жа годзе паступіў на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, які скончыў у 1990 г. таксама з адзнакай. Сямігадовы тэрмін навучання быў выкліканы тым, што ў 1984–1986 гг. наш юбіляр праходзіў службу ў Савецкай Арміі.

Кажучы пра гісторыю, кожны з прадстаўнікоў гэтага прафесійнага цэха ўзгадвае крылаты выраз часоў старажытнасці, што менавіта *яна* для людзей з'яўлялася сапраўднай настаўніцай жыцця (*Historia est magistra vitae*). Але Аляксандр Мікалаевіч гісторыкам мог і не стаць: захапляўся журналістыкай, публікаваўся ў «Піянерскай праўдзе», «Зорцы», перамагаў у конкурсах сачыненняў. Інтарэс да гісторыі ўмацоўвалі, стымулявалі яе далейшае пазнанне і акрэслівалі патрэбу ў больш глыбокім вывучэнні людзі, якія вучылі яго і аддавалі часцінку сваёй душы, – настаўніцы пачатковых класаў Соф'я Аляксандраўна Страха і Марыя Андрэеўна Грышко і асабліва дырэктар Рубельскай сярэдняй школы Адам Міхайлавіч Вяроха, які выкладаў гісторыю. Дзякуючы менавіта ім Аляксандр у школьныя гады пачаў захапляцца гісторыяй, шмат чытаў дадатковай літаратуры, у т. л. малавядомыя для яго равеснікаў спецыяльныя гістарычныя часопісы, але часцей за ўсё сам дзяліўся краналынымі гісторыямі, пачутымі ад вяскоўцаў, родных і блізкіх.

Але самымі галоўнымі настаўнікамі па жыцці і для вучня сярэдняй школы, і для студэнта-гісторыка, і для будучага знанага навукоўца заўсёды з'яўляліся любыя бацькі – Мікалай Мацвеевіч і Вольга

Пятроўна, якія прывілі сыну працаздольнасць, цярпенне, прыстойнасць і гуманізм.

Пасля заканчэння БДУ Аляксандр Мікалаевіч быў накіраваны на працу ў акадэмічны Інстытут гісторыі. Аднак па сямейных абставінах неўзабаве пераразмеркаваўся ў Брэст для працы школьным настаўнікам гісторыі ў сярэднюю школу № 21, у якой працаваў на працягу 1990–1992 гг.

Здабыты вопыт настаўніцтва быў значна ўзбагачаны, калі выпускнік гістарычнага факультэта БДУ А. М. Вабішчэвіч пачаў працу над тэмай кандыдацкай дысертацыі «Нацыянальная школа ў Заходняй Беларусі: стан, праблемы захавання (1921–1939 гг.)». Яго навуковым кіраўніком быў доктар гістарычных навук, прафесар, акадэмік Міхаіл Паўлавіч Касцюк, які вылучаўся высокім прафесіяналізмам і грамадзянскай мужнасцю. Датэрмінова была скончана аспірантура і паспяхова абаронена ў 1996 г. кандыдацкая дысертацыя. Пазней Міхаіл Паўлавіч стаў кансультантам пры напісанні доктарскай дысертацыі А. М. Вабішчэвіча «Нацыянальна-культурнае жыццё ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)», якую Вышэйшая атэстацыйная камісія Рэспублікі Беларусь прызнала лепшай доктарскай дысертацыяй па гуманітарных навуках 2011 г. Знаёмства з Міхаілам Паўлавічам Касцюком пераканала маладога гісторыка ў тым, што на кожным этапе чалавек павінен трымаць свой жыццёвы экзамен, быць здольным інтэлектуальна адказваць на выклікі часу, мець дастаткова ведаў, гартаваць волю і ніколі не развітвацца з надзеяй.

А. М. Вабішчэвіч – аўтар больш за 350 публікацый у навуковых, навукова-папулярных і вучэбна-метадычных выданнях Беларусі, Расіі, Польшчы, Украіны, Літвы. Аб'ектам вывучэння ў манаграфіі «Асвета ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)» сталі стан і праблемы захавання нацыянальнай адукацыі ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг., асвета большай, аўтахтоннай часткі насельніцтва – беларусаў.

Важнай з'явай у беларускай гістарычнай навуцы стала выдадзеная ў 2008 г. манаграфія «Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921– 1939 гг.)», у якой на падставе шырокага кола айчынных і замежных крыніц прааналізаваны ідэалагічныя і палітычныя пастулаты, прававыя падставы, механізмы рэалізацыі палітыкі польскіх улад у галіне культуры, асветы беларусаў і іншых этнічных супольнасцей, адлюстраваны стан беларускай адукацыі, культурна-асветніцкай працы, вызначана роля гісторыка-культуралагічных даследаванняў, навукова-асветніцкай работы ў захаванні, папулярызацыі спадчыны беларускага народа, прасочаны адносіны хрысціянскіх канфесій да пытанняў культуры, адукацыі, мовы, традыцый беларусаў, раскрыта дзейнасць польскіх культурна-асветніцкіх, грамадскіх арганізацый і ўстаноў і вынікі іх працы.

Сапраўдным помнікам усім людзям, хто на працягу стагоддзяў пражываў і цяпер жыве у в. Рубель, стала кніга А. М. Вабішчэвіча «Вёска Рубель на Століншчыне: гісторыка-краязнаўчы нарыс» – вынік шматгадовага даследавання гісторыі роднай вёскі, якое пачалося яшчэ падчас падрыхтоўкі гісторыка-дакументальнай хронікі Столінскага раёна «Памяць». У гэтай кнізе ён раскрыў асноўныя этапы гісторыі сваёй малой радзімы – в. Рубель, дзе спрадвеку жылі многія пакаленні яго продкаў, дзе прайшло яго дзяцінства. Нягледзячы на заяўлены навукова-папулярны характар, кніга, па сутнасці, з'яўляецца паўнавартаснай манаграфіяй. У кнізе змешчаны радавод аўтара, у якім перапляліся некалькі рубельскіх родаў – найперш Вабішчэвічы, Пашкевічы, Машлякевічы, Шпакоўскія. Складзены на падставе разнастайных дакументаў, пераважна архіўных, ён бярэ пачатак з XV ст.

Аляксандр Мікалаевіч з'яўляецца сааўтарам шасцітомнай «Гісторыі Беларусі», «Гісторыя Пінска. Ад старажытнасці да сучаснасці», манаграфіі «Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг.». Ён таксама ўдзельнічаў у падрыхтоўцы зборніка дакументаў і матэрыялаў «Польша – Беларусь (1921–1953)». Сумесна з польскімі даследчыкамі А. М. Вабішчэвічам былі выдадзены ў 2013–2014 гг. у Варшаве два даведнікі «Polska – Białoruś. Wspólne dziedzictwo historyczne. Przewodnik po materiałach archiwalnych 1918–1939», у якіх упершыню была распрацавана база пошуку дакументальных матэрыялаў па гісторыі заходнебеларускіх зямель у складзе Польскай дзяржавы (1918–1939 гг.), што захоўваюцца ў архівах Рэспублікі

Беларусь. Пад яго рэдакцыяй таксама выдадзены сумесны беларуска-польскі зборнік навуковых прац «Polska – Białoruś. Wspólne dziedzictwo historyczne. Powstanie styczniowe w tradycji i myśli politycznej Polski i Białorusi».

У 2019 г. у выдавецтве «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» выйшла ў друку энцыклапедыя «Брест. Брэст. Brest. 1000» – унікальнае выданне, прысвечанае 1000-годдзю горада над Бугам, якое ўключае каля тысячы артыкулаў, прысвечаных гісторыі, адміністрацыйна-тэрытарыяльнаму падзелу, архітэктуры, помнікам Брэста, яго эканоміцы, адукацыі, навуцы, культуры, ахове здароўя і іншым сферам. А. М. Вабішчэвіч быў каардынатарам падрыхтоўкі, складальнікам і сааўтарам энцыклапедыі.

Публікацыі А. М. Вабішчэвіча істотна ўзбагачаюць беларускую гістарычную навуку. Без яго навуковых распрацовак, тэзісаў і ацэнак сёння нельга ўявіць сучасную беларускую, расійскую і замежную гістарыяграфію. Можна спрачацца адносна некаторых яго думак, не пагаджацца з ацэнкамі, але фактам застаецца тое, што працы прафесійнага гісторыка ў цяперашні час запатрабаваны, іх пасля прачытання не кладуць на паліцы – да іх пастаянна звяртаюцца, нягледзячы на час выдання некаторых з іх. Яго працы заўсёды носяць дакументальны характар, адрозніваюцца наватарскім падыходам, напоўнены глыбокім сэнсам, што прымушае зацікаўленых чытачоў звяртацца да іх зноў і зноў. Даследаванні А. М. Вабішчэвіча па гісторыі Заходняй Беларусі міжваеннага перыяду цытуюцца ў замежных працах і выкарыстоўваюцца даследчыкамі.

А. М. Вабішчэвіч выступаў з дакладамі на больш чым 200 міжнародных, рэспубліканскіх і рэгіянальных навуковых канферэнцыях, семінарах у Беларусі і за яе межамі.

Аляксандр Мікалаевіч удзельнічае ў падрыхтоўцы кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Падрыхтаваў двух кандыдатаў навук: пад яго кіраўніцтвам паспяхова абаранілі дысертацыі В. М. Мярчук «Эміграцыя насельніцтва з Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)» (2016 г.) і Л. В. Лаўрэнка «Прамысловасць, рамесніцтва і гандаль на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)» (2021 г.). Неаднаразова выступаў у якасці апанента пры абаронах доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый. У 2015–2024 гг. з’яўляўся членам экспертнага савета ВАК Рэспублікі Беларусь па гістарычных навуках.

Навуковую працу А. М. Вабішчэвіч паспяхова спалучае з выкладчыцкай. Больш за 30 гадоў жыццёвы шлях Аляксандра Мікалаевіча звязаны з Брэсцкім дзяржаўным універсітэтам імя А. С. Пушкіна – Брэсцкім дзяржаўным педагагічным інстытутам імя А. С. Пушкіна, у якім ён прайшоў шлях ад асістэнта да прафесара. Быў намеснікам дэкана, дэканам гістарычнага факультэта (2003–2004 гг.), у 2004–2008 гг. – загадчыкам кафедры гісторыі культуры і рэлігіі, у 2008–2021 гг. – загадчыкам кафедры гісторыі славянскіх народаў, прафесарам кафедры гісторыі славянскіх народаў. З 2025 г. працуе прафесарам кафедры гісторыі Беларусі і спецыяльных гістарычных дысцыплін.

А. М. Вабішчэвіч з’яўляецца вопытным выкладчыкам. У 2007 г. ён станавіўся лаўрэатам універсітэцкага конкурса «Майстар лекцыйных заняткаў». На лекцыях і семінарскіх занятках Аляксандр Мікалаевіч дзеліцца сваімі фундаментальнымі ведамі па розных вучэбных дысцыплінах са студэнтамі, дзе яго чакаюць удзячныя слухачы. Менавіта ў студэнцкай аўдыторыі прафесійны гісторык знаёміць моладзь са сваімі глыбокімі роздумамі пра ўнікальную спадчыну беларускага народа, уводзіць новыя дакументальныя знаходкі і творчыя напрацоўкі, пры гэтым не пакідае без увагі існуючыя да гэтага часу «белыя плямы» гісторыі.

Пры непасрэдным удзеле Аляксандра Мікалаевіча ў межах супрацоўніцтва з Брэсцкай епархіяй Беларускай Праваслаўнай Царквы праведзены I, II і III міжнародныя навукова-практычныя канферэнцыі «Праваслаўе ў духоўным жыцці Беларусі» (2007, 2011 і 2013 гг.), міжнародная навукова-багаслоўская канферэнцыя да 400-годдзя памяці дабравернага князя К. Астрожскага (2008 г.), шэраг рэгіянальных канферэнцый і семінараў.

У цяперашні час пад яго кіраўніцтвам працягваецца рэалізацыя навукова-даследчая работа «Грамадска-палітычныя, сацыякультурныя і канфесійныя праблемы беларусаў у кантэксце гісторыі славянскіх народаў у XX – пачатку XXI ст.».

Аляксандр Мікалаевіч уваходзіць у склад рэдакцыйных калегій (саветаў) шэрагу айчынных і замежных навуковых часопісаў.

За шматгадовую навуковую, арганізацыйную і педагагічную работу, высокія паказчыкі, дасягнутыя ў правядзенні навуковых даследаванняў, плённым выхаванні і развіцці моладзі А. М. Вабішчэвіч узнагароджаны граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай ВАК Рэспублікі Беларусь, Ганаровымі граматамі ўпраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама, БрДУ імя А. С. Пушкіна, атрымаў падзякі Міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Брэсцкага аблвыканкама, Старшыні Прэзідыума НАН Беларусі, Інстытута гісторыі НАН Беларусі, Брэсцкай епархіі БПЦ, ён лаўрэат Прэміі імя У. А. Калесніка ў галіне сацыяльных і гуманітарных навук. У 2016 і 2017 гг. быў занесены на Дошку гонару БрДУ імя А. С. Пушкіна.

Плённа працуючы на ніве нацыянальнай гістарычнай навукі, Аляксандр Мікалаевіч Вабішчэвіч не перастае радаваць чытачоў і студэнтаў не толькі сваімі новымі навуковымі працамі, даследчыцкімі ідэямі, але і сваёй вернасцю навуковым традыцыям. Таму хочацца шчыра пажадаць юбіляру моцнага здароў'я, творчых поспехаў і плёну ў здзяйсненні новых задумак!

***Уладзімір Васільевіч Здановіч,***
*доктар гістарычных навук, прафесар, прафесар кафедры гісторыі Беларусі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
***Таццяна Пятроўна Саўчук,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі Беларусі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*